УДК 94(476)

# БЕЛАРУСКІЯ ГІМНАЗІІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: СУЧАСНАЯ АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

***Кірыл Ананька***
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь*
kirixan@yandex.ru

Аўтар робіць агляд даследванняў і аналізуе ступень вывучанасці тэмы беларускіх гімназій у міжваеннай Заходняй Беларусі ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы. Зроблена выснова аб неабходнасці комплекснага даследвання, вылучаны асноўныя накірункі для вывучэння праблемы.

***Ключавыя словы: гісторыя, беларускія гімназіі, Заходняя Беларусь, гістарыяграфія***

# BELORUSSIAN GYMNASIUMS IN WESTERN BELARUS: THE MODERN HISTORIOGRAPHY

***Kirill D. Ananko***
*Yanka Kupala State University of Grodno, Belarus*

The author reviews the research and analyzes the degree of study of the topic of Belarusian gymnasiums in interwar Western Belarus in modern Belarusian historical science. The author concludes that a comprehensive study is necessary. The author also identified the main directions for studying the problem.

***Key words: history, belarusian gymnasiums, Western Belarus, historiography***

Тэма беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд атрымала сваё актыўнае развіццё ў навуковым гістарычным дыскурсе пасля распаду Савецкага Саюза. Змена геапалітычнага становішча, адыход ад ідэалагічных установак, адкрыццё і выкарыстанне недаступных раней крыніц стварылі магчымасць беларускім даследчыкам вывучаць некаторыя аспекты айчыннай гісторыі, якія раней былі недаследаваны. Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд з'яўляліся не толькі ўстановамі сярэдняй адукацыі польскай дзяржавы, але і пунктамі канцэнтрацыі беларускай культуры, мовы і з'яўлялася “кузняй” нацыянальнай эліты ва ўмовах прыгнёту з боку польскага ўрада. У 1990-я гг. беларускія гімназіі разглядаліся амаль выключна як асветніцкія ўстановы і частка нацыянальных беларускіх агульнаадукацыйных школ, якія дзейнічалі ва ўмовах паліыткі паланізацыі з боку польскага ўраду на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Толькі на пачатку 2000-х гг. з надаваннем актуальнасці праблеме беларускага нацыянальнага пытання ў Заходняй Беларусі ў міжваенны час гімназіі пачынаюць успрымацца як цэнтры беларускага нацыянальна-культурнага жыцця.

Адным з буйнейшых даследчыкаў па вывучэнню нацыянальна-культурнага пытання ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд з’яўляецца доктар гістарычных навук, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч, у працах якога разглядаліся пытанні беларускай нацыянальнай асветы ў міжваенны час. Адметная рыса даследчыка – выкарстоўванне і аналіз шырокага кола крыніц па праблеме. Менавіта А. М. Вабішчэвіч адзін з першых звярнуў увагу на тое, што беларускія гімназіі былі таксама кропкамі канцэнтрацыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі. Адной з першых, прысвечанных канкрэтна беларускім гімназіям, стала праца «Беларуская гімназія ў Навагрудку» [1]. Ва ўступе артыкула даследчык указаў, што беларускія гімназіі “…з’яўляліся вучэбна-метадычнымі цэнтрамі (асабліва Віленская), асяродкамі палітычнага і культурна-асветніцкага жыцця Заходняй Беларусі” [1, с. 72]. У працы апісваецца храналогія вучэбнай дзейнасці Навагрудскай беларускай гімназіі, робіцца кароткі статыстычны аналіз колькасці і сацыяльнага складу вучняў і толькі павярхоўна закранаецца удзел гімназістаў у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху.

У артыкуле «Беларускія гімназіі ў культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі (1920 – 1930-я гг.)» [2] брэсцкі гісторык пашырыў геаграфію агляда дзейнасці беларускіх гімназій. А. М. Вабішчэвіч называе 6 беларускіх гімназій, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі на пачатку 1920-х гг. – у Вільні, Гродне, Нясвіжы, Навагрудку, Радашковічах, мястэчку Гарадок Вілейскага павета [2, с. 78]. Дадзеную працу можна ўмоўна падзяліць на дзве частцы: у першай даецца аналіз арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсаў у беларускіх гімназіях, роля Таварыства Беларускай Школы (ТБШ) у падрымцы дзейнасці гімназій; у другой – раскрываецца дзейнасць гімназістаў у беларускім нацыянальным руху 1920-х – 1930-х гг., робіцца аналіз ролі падпольнага камсамолаў у сценах гімназій, іх уплыву на

светапогляд навучэнцаў. Даследчык таксама адлюстраваў працу вядомых беларускіх дзеячоў міжваеннага часу, сярод якіх былі М. Гарэцкі, А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, С. Паўловіч і іншыя. Асаблівая ўвага аўтара ў артыкуле надаецца Віленскай беларускай гімназіі як вучэбна-метадычнага цэнтру нацыянальных беларускіх пачатковых і сярэдніх школ Заходняй Беларусі.У абедзвюх працах аўтар абапіраецца выключна на архіўныя і прасапраграфічныя матэрыялы.

У манаграфіі А. М. Вабішчэвіча «Асвета ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.)» беларускім гімназіям прысвечана асобная глава [3, с. 55–70]. Дадзеная глава ўяўляе сабой пашыраны варыянт вышэй названага артыкула. Рэзюмуючы даследчык сцвярджае, што беларускія гімназіі з'яўляліся вучэбна-метадычнымі цэнтрамі, нацыянальнымі асяродкамі культурна-асветніцкага і палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, якія супрацьстаялі палітыцы паланізацыі. Падобны змест дзейнасці беларускіх гімназій адлюстроўваецца ў раздзеле «Адукацыя і культурна-асветніцкі рух як сродкі этнічнага самазахавання беларусаў» манаграфіі «Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» [4, с. 37–64]. Выкарыстаўшы шырокі пералік крыніц, даследчык выявіў сваеасаблівую ролю беларускай асветы (у тым ліку і падтрымання дзейнасці беларускіх гімназія) у ліквідацыі непісьменнасці, супрацьдзенні паланізацыі, павышэнні і захаванні нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва. Аднак у працах А. М. Вабішчэвіча большасць увагі завостраная менавіта на дзейнасці Віленскай беларускай гімназіі. У гэты ж момант іншыя беларускія гімназіі з'яўляліся важнымі рэгіянальнымі кропкамі падрыхтоўкі беларускіх кадраў у нацыянальным руху міжваеннай Заходняй Беларусі.

Не менш важным з'яўляецца аспект палітыкі польскага ўрада ў дачыненні да беларускіх гімназій і беларускай асветы ў цэлым. Пытанне палітыкі польскіх уладаў у галіне беларускай адукацыі разгледзеў кандыдат гістарычных навук, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Аляксей Мікалаевіч Загідулін у сваім артыкуле «Дзяржаўная палітыка Польшчы ў галіне беларускай адукацыі» [5]. На думку даследчыка палітыка польскіх улад у дадзеным пытанні была супярэчлівай. З аднаго боку, пад уздзеяннем хвалі лібералізму польскі ўрад выдзяляў грошы і ўласныя будынкі для арганізацыі навучальнага працэсу, а таксама ствараў стаўкі для настаўнікаў Віленскай і Навагрудскай гімназій. Другі бок – з пачатку 1930-х гг. польскія ўлады на падставе паланізацыі змянілі акцэнт адносін да беларускай асветы аж да закрыцця беларускіх навучальных устаноў, сярод якіх былі гімназіі, і забарона выкладаць на беларускай мове. Як лічыць А. М. Загідулін, гэта было звязана не з жаданнем дыскрымінацыі беларусаў, а ў асноўным з наяўнасцю камуністычнага руху ў сценах навучальных устаноў.

У манаграфічным выданні беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук Уладзіміра Віктаравіча Ляхоўскага «Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.)» [6] аналізуецца дзейнасць беларускіх гімназій у кантэксце разгляду грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай працы беларускіх моладзевых суполак і згуртаванняў у міжваеннай Заходняй Беларусі. Падраздзел «Чыннасць вучнёўскіх гурткоў у заходнебеларускіх гімназіях» [6, с. 258–259] прадстаўляе з сабе кароткую агульную характарыстыку існавання і ўмоў дзейнасці беларускіх гімназій на тэрыторыі Беларусі. У падраздзеле «Вучнёўскія арганізацыі ў Віленскай беларускай гімназіі» [6, с. 259–278] раскрываецца сумесная вучэбна-выхаваўчая праца настаўнікаў і навучэнцаў Віленскай беларускай гімназіі як вучэбна-метадычнага цэнтра беларускай пачатковай і сярэдняй адукацыі з акцэнтам на характарыстыку нацыянальна-культурнага аспекту ўнутрыгімназічнага асяроддзя. У падраздзеле «Школьнае жыццё ў сценах Навагрудскай, Радашковіцкай і Нясвіжска-Клецкай беларускіх гімназій» [6, с. 278–300] даследчык таксама раскрывае ўдзел астатніх беларускіх гімназій у грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі, асабліва адзначыўшы змаганне за захаванне нацыянальнай школы ва ўмовах палітыкі паланізацыі з боку польскіх улад. Трэба звярнуць увагу на тое, што ў сваёй манаграфіі У. В. Ляхоўскі выкарыстаў вялізарную колькасць ілюстрацыйнага матэрыялу і фатаздымкаў, у апісанні якіх была зроблена спроба ідэнтыфікацыіі пэўных асобаў. Але ў працы фрагментарна закранаецца ўмовы і механізмы пачатку дзейнасці і закрыцця беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Як ужо адзначалася, Віленская беларуская гімназія, канцэнтруючы вакол сабе прафесійныя педагагічныя кадры, стала вучэбна-метадычным цэнтрам, дзе распрацоўваліся падручнікі, вучэбныя і выхаваўчыя праграмы для ўсёй беларускай нацыянальнай сярэдняй адукацыі. Гэтыя працэсы былі адлюстраваны ў работах ужо згаданага А. М. Вабішчэвіча. Пры гімназіі дзейнічалі розныя вучнёўскія гурткі, якія вялі культурна-асветніцкую працу, спрыялі павышэнню кантактаў і падтрыманню дысцыпліны сярод вучняў. Спроба раскрыцця дзейнасці вучнёўскіх гурткоў у Віленскай беларускай гімназіі была зроблена даследчыкам Уладзімірам Пятровічам Серпухавым. У артыкуле «Дзейнасць вучнёўскіх гурткоў Віленскай беларускай гімназіі» [7] згадваецца пра вучнёўскую раду. З-за невысокай эфектыўнасці працы рада была пераўтворана ў гурток моладзі Віленскай беларускай гімназіі, які падзяліўся на шэраг фактычна секцый: гістарычна-літаратурную, драматычную, музычную, мастацкую, бібліятэчную і эсперанта [7, с. 30]. З цягам часу гэтыя секцыі былі пераўтвораны ў самастойныя гурткі, якія ладзілі культурна-асветніцкія

мерапрыемствы, падтрымлівалі кантакты з іншымі арганізацыямі і беларускімі гімназіямі. У 1922 г. нават было ініцыянавана стварэнне першых беларускіх скаўцкіх дружын спартыўнага накірунку.

Беларускія гімназіі таксама адлюстраваліся ў даследваннях напрамку гістарычнай памяці. У 2019 г. споўнілася 100 год з часу заснавання Віленскай беларускай гімназіі. Гэтай круглай даце была прысвечана праца вядучага бібліёграфа Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Кацярыны Дзмітрыеўны Варанько [8]. Даследчык коратка апісвае храналогію дзейнасці гімназіі, згадвае некаторых настаўнікаў і дырэктараў гімназіі. Таму дадзеная праца носіць выключна азнаямленчы характар.

У сучаснай беларускай гістарычнай навуцы набірае актуальнасць выкарыстанне прасапаграфічнага метаду – выяўленне пэўнага кола асоб, пабудова іх калектыўных біяграфій для даследавання пэўнай праблемы.Для выкарыстання гэтага метаду ў тым ліку патрабуецца вывучэнне шырокага шэрагу мемуарных крыніц, пошуку “сведак” той эпохі. Спробу падобнага даследвання зрабіў кандыдат філалагічных навук Ігар Уладзіміравіч Гетман у артыкуле «Школа як школа»: Віленская беларуская гімназія вачыма сваіх вучняў» [9]. На падставе ўспамінаў В. Жук-Грышкевіча і асабістых размоў з былымі вучнямі гімназіі А. А. Засімам і М. М. Шопікам у артыкуле раскрываюцца некаторыя моманты паўсядзённага жыцця, нацыянальных настрояў і памкненняў беларускай моладзі ў сценах Віленскай беларускай гімназіі.

У 2011 г. у часопісе «Маладосць» быў надрукаваны тэкст Ігара Максімавіча Бурсевіча [15] – выпускніка Віленскай беларускай гімназіі, сына беларускага палітычнага дзеяча Максіма Тарасавіча Бурсевіча. Тэкст быў падрыхтаваны яшчэ ў 1978 г. і мае аўтабіяграфічны характар. Аўтар апісвае падзеі падчас вучобы ў гімназіі, дэталёва закранаюцца працэсы палітычныя абставіны дзейнасці гімназіі. Аўтар падзяліў тэкст на лагічныя часткі: тэрытарыяльнае размяшчэнне, характарыстыка ўмоў працы гімназіі, навучальны працэс, палітычныя абставіны ў Заходняй Беларусі і ў гімназіі ў прыватнасці. Завяршаецца тэкст апісаннем асабістай вучобы ў гімназіі.

Нягледзячы на тое, што самымі вядомымі на сённяшні дзень застаюцца Віленская, Навагрудская, Клецкая і Радашковіцкая беларускія гімназіі, на рубяжы 1910-х – 1920-х гг. дзейнічалі таксама і беларускія гімназіі ў Гродне і м. Будслаў (сёння Мядзельскі раён Мінскай вобласці). Гродзенская і Будслаўская беларускія гімназіі праіснавалі нядоўга, але пакінулі пасля сябе спадчыну. У раздзеле «Мартыролаг беларускай школкі ў Гродне» работы гродзенскага даследчыка, кандыдата гістарычных навук Андрэя Мікалаевіча Чарнякевіча «Старонкі гісторыі Беларускай Гародні»[10] згадваецца існаванне Гродзенскай беларускай гімназіі, якая была адчынена 29 лістапада 1920 г. намаганнямі Б. Тарашкевіча і В. Іваноўскага. Але ўстанова хутка была зачыненна з-за адсутнасці фінансавай падтрымкі.

Даследваннем Будслаўскай беларускай гімназіі займаўся выпускнік гістарычнага факультэта Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта Вадзім Прэўрацкі. Яго даследванне знайшло месца ў серыі артыкулаў у газеце «Наша Слова» [11–13]. Нягледзячы на часопісныя публікацыі, работы В. Прэўрацкага маюць менавіта навуковы характар з-за наяўнасці спасылак на дакументы і архіўныя матэрыялы. Канчатковым вынікам яго працы па вывучэнню Будслаўскай гімназіі стаў артыкул «Станаўленне і пачатковае развіццё беларускай школы на Мядзельшчыне ў першай чвэрці XX ст.» [14]. Аўтар, выкарыстоўваючы дакументы, мемуары і іншыя крыніцы, зрабіў спробу аналіза намаганняў мясцовага насельніцтва сучаснага Мядзельскага раёна да наяўнасці беларускіх нацыянальных асветніцкіх устаноў, закранаючы пры гэтым існаванне і дзейнасць Будслаўскай беларускай гімназіі.

Не менш важнымі ў вывучэнні тэмы з'яўляюцца даследаванні беларускіх краязнаўцаў, пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў. Да такіх даследванняў адносіцца манаграфія «Наваградская беларуская гімназія» [16] беларускага пісьменніка, педагога і журналіста Андрэя Чэмера (сапр. імя Аляксей Сцяпанавіч Анішчык). А. Чэмер. Як выпускнік гэтай гімназіі, аўтар зрабіў спробу дэталёвага апісання дзейнасці беларускай гімназіі ў Навагрудку ад даты стварэння да закрыцця. У працы беларускага краязнаўца, публіцыста і педагога Васіля Міхайлавіча Сокала «Клецкая гімназія» [17] зроблен акцэнт на характарыстыцы педагагічнага складу, вучэбна-выхаваўчага працэсу і арганізацыі камуністычнага падполля ў сценах гімназіі. Але трэба звярнуць увагу на павярхоўныя статыстычныя дадзеныя і адсутнасць спасылак на навуковыя выданні, дакументы ці архіўныя матэрыялы.

Энцыклапедычныя выданні ўтрымліваюць картокую азнаямленчую інфармацыю дзейнасці беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Карысным з’яўляецца 6-томнае выданне «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі»[18], якое таксама ўтрымлівае інфармацыю аб дзейнасці беларускіх гімназій. Так, на старонках розных тамоў выдання можна знайсці інфармацыю пра Будслаўскую [18, т. 2, с. 116], Віленскую [18, т. 2, с. 279–281], Клецкую [18, т. 4, с. 194–195], Навагрудскую [18, т. 5, с. 257–258], Нясвіжскую [18, т. 5, с. 343–344] і Радашковіцкую [18, т. 6, с. 50] беларускія гімназіі. Да энцыклапедычных даведнікаў адносіцца шматтомнае выданне гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць», якое агульна складаецца з 151 кнігі. Кароткія звесткі пра дзейнасць беларускіх гімназій (далей БГ) трымаюцца ў раённых гісторыка-дакументальных хроніках: Будслаўская БГ – гіст.-дакум. хроніка Мядзельскага раёна, Нясвіжская БГ – гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна, Клецкая БГ – гіст.-дакум.

хроніка Клецкага раёна, Навагрудская БГ – гіст.-дакум. хроніка Навагрудскага раёна[19, с. 269–270], Радашковіцкая БГ – гіст.-дакум. хроніка Маладзечанскага раёна [20].

Стан сучаснага навуковага вывучэння тэмы з'яўляецца не поўным і заключаецца ў адсутнасці комплекснага даследвання праблемы беларускіх гімназій у грамадска-палітычным і культурным жыцці Заходняй Беларусі ў міжваенны час. Наяўнасць комплекснага даследвання магла б сістэматызаваць актуальныя пытанні адносна беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў сучасная гістарычнай навуцы. На сённяшні момант паўстае два галоўных пытання адносна разглядаемай праблемы. Па-першае, існуе неабходнасць комплекснага аналізу ўтварэння і функцыянавання беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі, дзе павінны разглядацца пытанні палітычных і заканадаўчых умоў утварэння, педагагічнага корпусу, дзейнасці вучняў і матывы закрыцця беларускіх гімназій польскімі ўладамі. Па-другое, неабходна прасачыць месца беларускіх гімназій у палітычных і культурных працэсах у міжваеннай Заходняй Беларусі.


1. Вабішчэвіч, А. М. Беларуская гімназія ў Навагрудку / А. М. Вабішчэвіч // Наваградскія чытанні. Выпуск IV: Матэрыялы навуковай канферэнцыі да 950-годдзя г. Навагрудка і 400-годдзя герба горада / навук. рэд. В. Ф. Кушнер. – Мн.: Беларускае выдавецкае Таварыства «Хата», 1996. – С. 72–75.
2. Вабішчэвіч, А. М. Беларускія гімназіі ў культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі (1920 – 1930-я гг.) / А. М. Вабішчэвіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2002. – № 18. – с.78–90.
3. Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.
4. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.
5. Загідулін А. М. Дзяржаўная палітыка Польшчы ў галіне беларускай адукацыі // Веснік ГрДУ. Серыя 1. Гуманітарныя навукі. – Гродна: ГрДУ, 2005. – С. 13–22.
6. Ляхоўскі, У. В. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. В. Ляхоўскі. – 2-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – 480 с.
7. Серпухаў, У. П. Дзейнасць вучнёўскіх гурткоў Віленскай беларускай гімназіі / У. П. Серпухаў // Веснік Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта. Серыя 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2007. – № 2. – С. 28–34.
8. Варанько, К. Д. 100 гадоў з часу заснавання Віленскай беларускай гімназіі / К. Д. Варанько // Адукацыя і выхаванне : штомесячны навукова-тэарэтычны і навукова-метадычны часопіс. – 2019. – № 7. – С. 78–79.
9. Гетман, І. У. «Школа як школа»: Віленская беларуская гімназія вачыма сваіх вучняў / І. У. Гетман // Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 верасн. 2009 г.) / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – С. 88–94.
10. Чарнякевіч, А. Старонкі гісторыі Беларускай Гародні [Электронны рэсурс] / А. Чарнякевіч. – Рэжым доступу: https://web.archive.org/web/20090725135848/http://harodnia.com/b03.php#link2. – Дата доступу: 09.12.2021.
11. Прэўрацкі, В. В. Будслаўская Беларуская гімназія (1917–1919). Дакументы і матэрыялы / В. В. Прэўрацкі // Наша Слова. – 2000. – 6 снежня. – С. 7.
12. Прэўрацкі, В. В. Нацыянальны архіў пра школу Заходняй Беларусі / Прэўрацкі В. В. // Наша Слова. – 2000. – 9 лютага. – С. 4.
13. Прэўрацкі, В. В. Скасаванне 1-й беларускай гімназіі ў Будславе / В. В. Прэўрацкі // Наша Слова. – 1999. – 22 верасня – С. 2.
14. Праўрацкі, В. Станаўленне і пачатковае развіццё беларускай школы на Мядзельшчыне ў першай чвэрці XX ст. [Электронны рэсурс] / В. Праўрацкі. – Рэжым доступу: https://library.by/portalus/modules/belarus/readme.php?subaction=showfull&id=1291897141&archive=1292000877&start_from=&ucat=&. – Дата доступу: 29.12.2021.
15. Бурсевіч, І. Віленская беларуская гімназія / І. Бурсевіч // Маладосць: штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс. – 2011. – № 4. – С. 136–141.
16. Чэмер, А. Наваградская беларуская гімназія. / А. Чэмер. – Вільнюс: UAB "Saverenas", 1997. – 133 с.
17. Сокал, В. Клецкая гімназія / В. Сокал // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 28–31.
18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал: Г.П. Пашкоў (галоўн. рэд.) [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1993–2003. – 6 т.
19. Анішчык, А. Наваградская беларуская гімназія (1919–1934) / А. Анішчык, Л. Мірачыцкі // Памяць: Навагрудскі раён. – Мн.: «Беларусь», 1996. – С. 269–270.
20. Памяць. Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ethno.by/seryi/979650390?tab=tab1. – Дата доступу: 30.12.2021.